**Манцэвіч, А. М.** Жыццё пражыць – не поле перайсці / А. М. Манцэвіч ; запісаў Б. Манцэвіч // Сцяг працы (Міёры). – 1996. – 2 ліп. – С. 2–3.

## ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЦЬ – НЕ ПОЛЕ ПЕРАЙСЦІ

**Гэтыя ўспаміны, слова ў слова, я запісаў у 1972 годзе ад сваёй маці Манцэвіч Аляксандры Міхайлаўны – былога камісара атрада «Масква» 4-й Беларускай партызанскай брыгады. Нязначная частка іх выкарыстана ў калектыўным зборніку «Люди Нарочанского края», які выпусціла ў свет выдавецтва «Беларусь» у 1975 годзе. Поўны тэкст я прапаную чытачам Міёрскай раённай газеты.**

**Барыс МАНЦЭВІЧ**
**г. Беразіно**

Напэўна, кожны чалавек на схіле гадоў задумваецца над пытаннем «Ці так я пражыў сваё жыццё? Ці ўсё магчымае зрабіў для свайго народа?». І я раблю вывад: не, жыццё маё пражыта не дарэмна. Мне не сорам быць сам насам са сваім сумленнем, пры сустрэчы з дзецьмі, унукамі, праўнукамі, знаёмымі.

Нарадзілася я 6 мая (23 красавіка па старым стылі) 1894 года ў сям'і народнага настаўніка Міхаіла Сямёнавіча Герасімава. Радзіма мая – сяло Велье Апочацкага павета Пскоўскай губерні. Сям'я наша была вялікая, але многія дзеці памерлі ў самым раннім узросце, і нас у жывых засталося толькі пяцёра. Я была самай малодшай. Бацька наш, выбіваючыся з апошніх сіл, стараўся прывіць дзецям любоў да кнігі. За ўдзел у рэвалюцыйным руху (ці ён быў сацыял-дэмакратам ці кім іншым – не ведаю) яму царскія ўлады забаранілі выкладаць у школе, і ён затым працаваў валасным пісарам. Мне і шасці гадоў не было, як бацька, разбіты паралічом, памёр. На выхаванне мяне ўзяў дабрадушны Фёдар Дзмітрыевіч Фёдараў, муж мамінай сястры. Фёдараў, працуючы начальнікам чыгуначнай станцыі Алькенікі Віленскай губерні, быў сапраўдным рускім патрыётам. Паколькі Фёдар Дзмітрыевіч быў бяздзетным, ён усю сваю любоў і пяшчоту, строгасць і дабрыню ўкладваў у маё выхаванне. Ён навучыў мяне любіць свой народ, Радзіму, ненавідзець прыгнятальнікаў.

З такімі поглядамі і закончыла я ў 1910 годзе ў Сакольскім павеце Гродзенскай губерні настаўніцкую семінарыю. У семінарыі гэтай, названай у гонар сына Мікалая II Аляксееўскай, вучыліся адны дзяўчаты.

Атрымаўшы на рукі накіраванне, я прыбыла ў мястэчка Паставы, дзе адпрацавала ў царкоўнапрыходскай школе да 1916 года. Ужо ў той час мне давялося сутыкнуцца з няпрошанымі гасцямі-чужаземцамі. А было гэта так. 19 верасня мы па ўсім бачылі, што немцы, якія акупіравалі Паставы, рыхтуюцца да адступлення, таму што сталі адыходзіць іх абозы, пачаліся падпалы. Гарэла праваслаўная царква, асобныя дамы. Немцы абматалі саломай поручні і сваі драўлянага маста цераз раку Мядзелку, па якім праходзілі войскі. У ноч на 20 верасня я заўважыла, што мост гарыць. Схапіўшы вядро, кінулася да ракі. Акупантаў ужо не было. Мне ўдалося збіць полымя, і мост быў выратаваны. За гэтым заняткам і засталі мяне перадавыя падраздзяленні рускай арміі. Камандаванне стала хадатайнічаць аб узнагароджанні мяне «Георгіеўскім медалём». У хуткім часе я яго і атрымала.

У 1917 годзе я выйшла замуж за настаўніка Флора Данатавіча Манцэвіча і пераехала на яго радзіму ў мястэчка Іказнь, што на Браслаўшчыне. На жаль, акупацыя Заходняй Беларусі буржуазна-памешчыцкай Польшчай не дазволіла мне доўга настаўнічаць – у 1926 годзе я вымушана была пакінуць педагагічную дзейнасць, таму што польскія ўлады сталі закрываць беларускамоўныя і рускамоўныя школы. Паўсюдна ўкаранялася мова польская. Я ж яе не ведала, таму сядзела без працы, знаходзячыся на ўтрыманні мужа.

Флор Данатавіч выйшаў з беднай сялянскай сям'і, галава якой Данат Паўлавіч быў чалавекам прагрэсіўных поглядаў, у падлеткавым узросце ўдзельнічаў у паўстанні Кастуся Каліноўскага, пра што іншы раз і расказваў нам. Закончыўшы ў 1910 годзе Полацкую настаўніцкую семінарыю, Флор Манцэвіч настаўнічаў спачатку ў Латвіі, а потым – на Браслаўшчыне, выключаючы перыяд Першай сусветнай вайны – тады ён служыў у ваенным шпіталі.

Будучы настаўнікам польскіх школ, ён, здаралася, вёў урокі на беларускай мове, хаця гэта ўладамі катэгарычна забаранялася. Дзе б муж ні працаваў (а яго пераводзілі са школы ў школу, не даючы магчымасці пастаянна трымацца на адным месцы), ён заставаўся верным свайму народу. Муж добра іграў на скрыпцы, збіраў народныя песні, якія развучваў з дзецьмі, моладдзю. Таму пілсудчыкі і сачылі за кожным яго крокам. Здаецца, вясной 1934 года на адным з афіцыйных прыёмаў з выпадку заканчэння навучальнага года нехта з прамоўцаў завяршыў сваю прамову воклічам: «Неж жые Польска!». А муж не разгубіўся і дабавіў: «І Беларусь!», а яго сябра Максім Астроўскі, украінец па нацыянальнасці, таксама крыкнуў ва ўвесь голас: «І Украіна!».

Такі выпадак польскія ўлады не даравалі: Ф. Манцэвіча і М. Астроўскага пазбавілі права выкладаць у школах. Аднак пад націскам народных мас цераз год іх аднавілі ў правах, але з пераводам у іншыя школы. Так у 1935 годзе наша сям'я апынулася ў вёсцы Старыя Крукі на Міёршчыне, дзе і настаўнічаў муж да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

А пакуль што ён працаваў у польскай школе, паліцэйскае сачэнне не спынялася. Асабліва яно ўзмацнілася, калі наша сям'я набыла радыёпрыёмнік-гучнагаварыцель (а гэта было ў 1936 годзе). Вечарамі ў наш дом, які мы арандавалі ў братоў Хведара, Міколы і Віктара Шаховічаў (во дзе цудоўныя людзі былі!), збіраліся дзясяткі сялян са Старых Крукоў і навакольных вёсак, каб паслухаць перадачы з Масквы і Мінска. Нярэдка нашы дзеці (а іх з васьмі чалавек на тую пару засталося толькі пяцёра) выступалі з невялікім канцэртам. Прыгадваю апошні Першамай у гады белапольскай акупацыі. Увечары да нас прыйшло каля сотні чалавек. Флор Данатавіч расказваў пра жыццё людзей у Савецкай Беларусі, звярнуў увагу на гаротнае становішча сялян Заходняй Беларусі. Пасля яго кароткай гутаркі ўключылі радыёпрыёмнік, па якім перадавалася святочная праграма. Пасля гэтага наша сям'я і дала канцэрт. Шасцігадовы Барыс, які стаяў на табурэце, разам са старэйшымі дзецьмі Лідай і Жэнем (Тоня вучылася ў Віленскай беларускай гімназіі) цягнуў мелодыю жалобнай песні «А ў нядзельку раненька». У ёй расказвалася пра цяжкі лёс будучага салдата. Бацька, праводзячы яго на вайну, кажа:

*На вайну ты паедзеш*
*І адтуль не прыедзеш.*

На тое сын адказвае:

*Не плач, татачка, пры мне,*
*Наплачашся без мяне.*
*Наплачашся даволі,*

*Як не ўбачыш ніколі.*

(Яно так у хуткім часе і атрымалася. У прыватнасці, у верасні 1939 года Хведар Шаховіч пайшоў у польскую армію і назад не вярнуўся).

Канцэрт суправаджаўся акампанементам дзвюх скрыпак: на адной іграў муж, а на другой – адзінаццацігадовы Юра, які праз два гады разам з дарослымі членамі сям'і ўключыцца ў народную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Сяльчане з усяго наваколля любілі і паважалі мужа. Праз шмат гадоў наш зямляк Генадзь Іванавіч Цітовіч, будучы ўжо народным артыстам Беларусі, выступаючы з артыкулам у часопісе «Огонек», скажа: «Я с великой благодарностью вспоминаю своего первого сельского учителя Флора Донатовича Манцевича; в далеком местечке Иказнь, на Браславщине, в двадцатые годы вместе с элементарной грамотностью вложил он в наши селянские души способность видеть, чувствовать и находить прекрасное».

У 1939 годзе, калі Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад буржуазна-памешчыцкага панавання, Флора Данатавіча выбралі дэпутатам Народнага (нацыянальнага) сходу, на якім ён у Беластоку выступіў з дакладам аб уз'яднанні Заходняй Беларусі ў адзінай савецкай сацыялістычнай дзяржаве, а затым у саставе паўнамоцнай камісіі разам з Міхасём Машарам, Сяргеем Прытыцкім, Піліпам Пестраком і іншымі ўдзельнікамі былога падполля прыняў удзел у рабоце Надзвычайнай сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

Айчынная вайна застала нашу сям'ю ў вёсцы Малая Кавалеўшчына, куды мы перасяліліся са Старых Крукоў у 1939 годзе – у доме Шаховічаў размясцілася хата-чытальня. Цяпер, з прыходам савецкай улады, і мне дазволілі настаўнічаць. Эвакуіравацца не справіліся. Дакладней, не змаглі, бо не далі нам ніякага транспарту. Раённае начальства супакойвала: «Каго і чаго вам баяцца? Флор Данатавіч – беспартыйны, яго не зачэпяць. Будзеце жыць спакойна».

Ля нашага дома праз колькі дзён сталі спыняцца воіны Чырвонай Арміі, каб адпачыць, паслухаць радыё. Шматлюдна было кожны дзень. Іншы раз даводзілася аказваць дапамогу параненым.

З пачаткам акупацыі мы з мужам бяссоннымі начамі думалі над тым, што рабіць і як рабіць. Да нашай размовы далучаліся Юра і Тоня, якая толькі што праводзіла на фронт свайго мужа, першага сакратара Міёрскага райкама камсамола Іосіфа Мельнікава.

– Па-першае, – прапаноўваў Флор Данатавіч, – трэба схаваць у надзейнае месца бібліятэку, мае беластоцкія і маскоўскія фатаграфіі. А то ўбачаць, што са Сталіным фатаграфаваўся – шыбеніцы не мінаваць. А потым… Потым збіраць патроны, зброю – усё, што можа нам спатрэбіцца. Што не зможам схаваць – спалім.

Між іншым Юра ўжо справіўся закапаць у зямлю некалькі тысяч вінтовачных патронаў, якія пакінулі акружэнцы.

І мы сталі рыхтаваць сябе да страшных дзён акупацыі. Балюча было бачыць, як па тракту Мёры – Дзісна рухаліся калоны фашыстаў. У мяне і сёння стаяць у вачах нахабныя самаўпэўненыя твары матацыклістаў. З закасанымі рукавамі кіцеляў, яны ехалі на ўсход. Гэта ўжо былі не тыя немцы, з якімі мне давялося сутыкнуцца ў Паставах. Гэтыя былі больш лютыя. Амаль уся Еўропа была ўжо пад іх нагамі. Ім захацелася і Савецкі Саюз пакарыць. Не, думала я, праводзячы фашыстаў пагардлівым позіркам, мала хто з вас жывым вернецца дадому.

У чым павінен заключацца сэнс падпольнай барацьбы, больш надзейнае мясцовае насельніцтва ведала з прамовы І. В. Сталіна, якое яно праслухала па нашым радыёпрыёмніку, з гутарак Флора Данатавіча. Трэба дзейнічаць неадкладна, з першага дня акупацыі.

Неяк прыцемкамі да нас прыбылі два малодшыя савецкія афіцэры. Па іх тварах, па іх голасу можна было здагадацца, што перш, чым трапіць да нас, яны працярпелі значныя пакуты.

– Кудаеў, – назваўся адзін.

– Светлалобаў, – працягнуў руку другі.

– Якім чынам трапілі да нас?

– Мы прабіліся з акружэння, – адказаў нехта з іх. – Там, за рэчкай, у сялянскім доміку нехта, па прозвішчу Пахірка, нам падказаў, што непадалёк ад іх жывуць настаўнікі, надзейныя людзі. Вось мы і прыйшлі да вас.

Паставіўшы на варце дзяцей, мы сталі частаваць гасцей. Тоня неадкладна стала выконваць распараджэнне свайго бацькі: дастала з шафы два мужчынскія касцюмы, споднюю бялізну, верхнія сарочкі. Цяжэй было з абуткам, але такія-сякія чаравікі знашлі. Пад'еўшы і памыўшыся, у цывільным адзенні пайшлі ад нас афіцэры. Аднак яны не развітваліся.

– Калі лёс з намі так абышоўся, то будзем дзейнічаць разам, – зазначылі яны.

І дзейнічалі. Пры пераправе цераз Заходнюю Дзвіну і Дзісёнку груп савецкіх воінаў яны разам з падпольшчыкамі ўдзельнічалі ў засадах. Кудаеў і Светлалобаў праводзілі сярод сяльчан гутаркі, усялялі ў іх веру ў непазбежнасць паражэння гітлераўскай Германіі.

Спачатку, безумоўна, ніхто з прадстаўнікоў «новага парадку» не ведаў ды і не мог ведаць пра разгортванне нашай падпольнай дзейнасці. Аднак знайшліся здраднікі, якія данеслі на мужа як на актыўнага барацьбіта за правы беларускага народа ў гады белапольскай акупацыі, як удзельніка Народнага сходу. І няпрошаныя госці паспяшаліся з'явіцца.

Было гэта, здаецца, 11 ліпеня , калі не памыляюся, на дзявяты дзень акупацыі. Цёплым сонечным ранкам Флор Данатавіч устаў, па звычцы, раней за ўсіх членаў сям'і. Вяртаючыся з рэчкі Волта з двума вёдрамі вады, ён заўважыў, як да дома падкаціла закрытая легкавая аўтамашына. У ёй ён пазнаў юнака са Старых Крукоў Івана Ракоцкага. Яго, як мы потым даведаліся, прымусілі паказаць дом Манцэвічаў. Нямецкі афіцэр, які дасканала валодаў рускай мовай, звярнуўся да мужа:

– Тут пражывае Флор Данатавіч Манцэвіч?

– Я і ёсць Манцэвіч.

– Падыдзіце, калі ласка, да машыны.

Паставіўшы вёдры на ганак, муж спакойна наблізіўся да легкавушкі.

– Нам трэба з вамі пагаварыць, – сказаў афіцэр.

– Калі ласка.

– Але не тут – у Мёрах. Сядайце і паедзем.

Мы заплакалі.

– Не плачце, – стараўся нас супакоіць Флор Данатавіч, – я хутка вярнуся.

– Так, так, ён хутка вернецца, – пацвердзіў немец. – Мы толькі дапытаем яго па адным пытанні і адпусцім.

Але майго мужа не адпусцілі. Цераз некалькі дзён, пасля невыносных катаванняў, яго павесілі ў Полацку, тым самым Полацку, у якім ён трыццаць адзін год таму назад заканчваў настаўніцкую семінарыю.

Так абарвалася жыццё дарагога мне чалавека, з якім не давялося разам пражыць нават чвэрці стагоддзя, якога так паважалі ўсе, хто яго ведаў. Але нават такое вялікае гора не пахіснула майго духу, і я старалася весці далей справу, пачатую разам з мужам.

Неўзабаве і мяне арыштавалі. Я лічыла, што больш мне ніколі не вярнуцца дадому, не весці работы сярод падпольшчыкаў. Мяне лупцавалі нагайкамі, пад пазногці засоўвалі іголкі, скінуўшы з крэсла на падлогу, білі ботамі. Усё хацелі даведацца, хто паміж Чэрасамі і Старымі Крукамі псуе тэлефонную сувязь, хто разбурае масты. На ўсе пытанні жандараў я адказвала адным і тым жа: «Нічога не ведаю, нічога не бачыла».

А тым часам на ўчастку бальшака Мёры – Дзісна мае дзеці Тоня, Юра і нават дзесяцігадовы Жэня ўжо справіліся некалькі разоў перарэзаць тэлефонныя правады. Гэта ж падпольшчыкі рабілі ў іншых месцах.

Не быць бы мне на свабодзе, калі б не кемлівасць мясцовых жыхароў. Яны ведалі, што кожны здраднік вельмі ахвочы на хабар. І мяне падпольшчыкі выкупілі. Была сабрана вялікая сума грошай, якія і выручылі мяне – я зноў аказалася на свабодзе. Дарэчы, неяк у пасляваенны час я вычытала ў рэспубліканскай прэсе, што ў Польшчы затрыманы некаторыя паліцэйскія, якія на тэрыторыі Мёрскага раёна падчас акупацыі ўчынілі крывавыя зверствы. Сярод прозвішчаў я ўбачыла прозвішчы тых, хто мяне арыштоўваў і катаваў у 1941 годзе.

Выйшаўшы на волю, я падпольную работу не спыняла, а, наадварот, усё пашырала і пашырала. Колькасць падпольных груп расла. Спачатку ў кожную з іх уваходзіла па два-тры чалавекі. Не было ў нас адзінага цэнтра. Але я падтрымлівала сувязь з усімі падпольшчыкамі. Ужо ў ліпені нас налічвалася 27 чалавек: Іван Фёдаравіч Лакотка, Іван Васільевіч Лакотка, іх бацькі Фёдар і Васіль, Іосіф Шчасны, Ігнат і Павел Сушко, Павел Шчасны, Сяргей Шчасны, Дзмітрый Фаміч Барок са сваімі бацькамі, Віктар Сушко і іншыя.

У канцы лета выбылі за межы раёна Кудаеў і Светлалобаў – нашы верныя памочнікі і кансультанты. Яны наважыліся прабіцца цераз лінію фронту да нашых. А калі гэта не ўдасца, гаварылі яны, то арганізуем партызанскі атрад. На вялікі жаль, пра далейшы лёс гэтых цудоўных людзей я нічога не ведаю.

Першапачаткова наша работа заключалася ў наступным: дапамагалі савецкім воінам, якія выходзілі з акружэння, набываць цывільнае адзенне, кармілі іх, перавязвалі і хавалі параненых. Адзін з іх, Мілун Аляксей Антонавіч, стаў актыўным падпольшчыкам. а затым перайшоў на адкрытую барацьбу з ворагам, уліўшыся ў партызанскі атрад.

Падпольшчыкі дапамагалі байцам і афіцэрам, якія выйшлі з акружэння, перапраўляцца цераз Дзісёнку і Заходнюю Дзвіну. Мікалай Малец зарэкамендаваў сябе выдатным праваднікам цераз балота Ельня.

Мы псавалі тэлефонную сувязь. Спачатку перараазалі правады, а потым сталі спілоўваць слупы. На дамбе цераз Чэраскае возера разбурылі мост, у выніку чаго на некалькі сутак быў паралізаваны рух па тракту Мёры – Дзісна.

Пасля майго першага вызвалення з турмы нямецкія ўлады, на дзіва, прапанавалі мне працаваць дырэктарам Чэраскай школы. Тоня і Юра параілі пагадзіцца з прапановай: маўляў, лягчэй будзе падтрымліваць сувязь з падпольшчыкамі – не тое падазрэнне.

Так мы зімой 1941–1942 года і апынуліся ў Чэрасах. Але прарабіць дырэктарам мне доўга не давялося – я зноў трапіла за краты. І на гэты раз фашысты ад мяне нічога не дабіліся. Зноўку мяне

выкупілі мясцовыя жыхары. У прыватнасці, вялікую суму грошай унёс чэраскі святар, таксама наш падпольшчык, Яўгеній Канстанцінавіч Багаткевіч. Вярнулася я ў школу радавой настаўніцай, а дырэктарам стала працаваць мая старэйшая дачка Антаніна. Акрамя нас дваіх яшчэ чатыры настаўнікі з'яўляліся падпольшчыкамі, у тым ліку той жа Аляксей Антонавіч Мілун і Марыя Мікалаеўна Казюліна (па мужу Шчасная).

Падполле пашыралася, і цяжкасцей не змяншылася. Мы, так сказаць, варыліся ў сваім саку, не адчуваючы ніякага кіраўніцтва як з боку партыйных органаў, так і з боку партызанскага камандавання. А тэрор супраць мірнага насельніцтва нарастаў. Першая ваенная зіма была самай цяжкай. Нарэшце ў 1942 годзе мне ўдалося наладзіць сувязь з браслаўскімі антыфашыстамі, у прыватнасці з братамі Аляксеем і Дзмітрыем Васілеўскімі. Першы з іх, атрымаўшы яшчэ да вайны юрыдычную адукацыю ў Чэхаславакіі, цяпер займаў пасаду намесніка браслаўскага павятовага старасты, а другі – старасты Слабодкаўскай воласці. Дзякуючы такім вось людзям удалося выратаваць ад смерці многіх савецкіх патрыётаў, а таксама ад вывазу ў нямеччыну дзясяткаў юнакоў і дзяўчат.

Улетку 1942 года дух падпольшчыкаў яшчэ больш узмацнеў, калі на тэрыторыі Мёрскага раёна паявіліся першыя партызаны на чале з І. А. Кабранавым. На пачатку будучага года ўстанавілі сувязь з упаўнаважаным Вілейскага абкома КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ Ананем Юльянавічам Міхасёнкам. Яму ішоў толькі дваццаць першы год, але ён быў не па ўзросту разважлівым і кемлівым чалавекам, які ўмеў працаваць у незвычайна цяжкіх умовах варожага акружэння. З яго дапамогай у Мёрах была створана падпольная камсамольская арганізацыя, якую ўзначаліў Георгій Манцэвіч, той самы Юра – мой старэйшы сын. Пазней кіраўніцтва гэтай арганізацыяй перайшло да Ірыны Гарбаценкі.

Вясной 1943 года група падпольшчыкаў пайшла ў партызаны. Сярод іх Мілун Аляксей, Матэленак Сцяпан і іншыя. Летам 1943 года падпольшчыкі папярэдзілі партызан аб тым, што супраць іх рыхтуецца нападзенне. Партызаны зрабілі засаду, і ў баі было забіта некалькі паліцэйскіх і намеснік шэфа жандармерыі Крыгер, а сам шэф Вайдэнрот трапіў у палон.

Да восені 1943 года ў маім распараджэнні ўжо налічвалася каля ста падпольшчыкаў, якія аб'ядноўваліся ў групы па чатыры-пяць чалавек, а такія як Чэраская і Мёрская, мелі па 15–20 чалавек. Над кожнай групай стаяў старшы, у якога была пэўная мянушка: Сасна, Бяроза, Волга, Антэна і г. д.

Другога верасня стала вядома, што фашысты рыхтуюць арышт усёй нашай сям'і. Дзякуй мёрскім падпольшчыкам: папярэдзілі своечасова, і ўвечары таго ж дня партызаны 6-га атрада 4-й Беларускай партызанскай брыгады вывезлі нашу сям'ю ў свой лагер. А назаўтра карны атрад быў у Чэрасах, але нікога з членаў нашай сям'і не застаў. Бежанцы з Дарагабужа-на-Дняпры, якія жылі на гэты час у памяшканні школы і якія дапамагалі нам збірацца ў нязведаны шлях, на роспыты карнікаў адказалі, што ўварваліся ў дом узброеныя людзі і пад дуламі аўтаматаў выгналі ўсіх Манцэвічаў на вуліцу і павезлі ў напрамку Мёр.

Знаходзячыся ў партызанскай зоне, сувязь з падпольшчыкамі я не губляла. З груп паранейшаму паступалі данясенні аб фашысцкіх гарнізонах, аб руху варожых падраздзяленняў, аб намеры акупантаў. Агентурная разведка працавала выдатна.

На пачатку 1944 года падпольшчыкі аб'ядналіся ў партызанскі атрад «Масква», аператыўна падпарадкаваны 4-й брыгадзе. Мяне назначылі камісарам атрада. Дыверсіі падпольшчыкаў не спыняліся. Юзя Шубіна спаліла ў Мёрах будынак валаснoй управы, у якой захоўваліся падатковыя

дакументы і спісы людзей, прызначаных для вывазу ў нямеччыну. Мужную патрыётку гітлераўцы схапілі і пакаралі смерцю, а яе брату Браніславу цудам удалося выратавацца.

Мёрскі раён уваходзіў у састаў Глыбоцкага гебітскамісарыята. І вось мы вырашылі займець у Глыбокім свайго разведчыка. Па майму загаду туды быў накіраваны Іван Фёдаравіч Лакотка з вёскі Татары. Пад мянушкай Шчаглоў ён уладкаваўся на кватэру да чугуначніка (прозвішча не памятаю), які аказаўся савецкім патрыётам. Шчаглоў атрымліваў ад яго каштоўнейшыя звесткі аб нямецкіх эшалонах, што праходзілі цераз станцыю Глыбокае.

Неўзабаве Шчаглову ўдалося згуртаваць невялікую групу падпольшчыкаў (бацька і сын Сабалеўскія, Нямірскі і іншыя). Група Шчаглова раздабыла друкарскі шрыфт, фарбы, партатыўны друкарскі станок і цераз чэраскага святара айца Яўгенія перапраівіла ўсё багацце ў Мёрскі раён, і праз некалькі дзён падпольная друкарня, размешчаная ў партызанскай зоне, стала дзейнічаць.

У Глыбокім падпольшчыкі выраблялі партызанам неабходныя пячаткі, даставалі чыстыя бланкі дакументаў, арганізоўвалі ўцёкі ваеннапалонных. Адным словам, шмат баявых спраў на рахунку групы, якой кіраваў Іван Фёдаравіч Лакотка – наш незаменны разведчык.

Урачы Гурленя з Дрысы і Вішнеўскі з Мёр не толькі забяспечылі партызан медыкаментамі, але іншы раз у сваіх пацыентаў-фашыстаў вывуджвалі карысную інфармацыю, якая патрэбна была партызанам.

У сакавіку 1944 года падпольшчыкі ў варожым друйскім гарнізоне падкінулі ў кацёл фашысцкай кухні яд, у выніку чаго каля 60 нямецкіх салдат апынуліся ў палявым шпіталі. Гэтую аперацыю правёў фельчар Сямглінскі, які ўжо знаходзіўся ў партызанскім атрадзе, цераз знаёмых друйскіх калег.

Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зрывалі пастаўкі акупантам сельгаспрадуктаў, праводзілі агітацыйна-масавую работу сярод насельніцтва. І вось у гэты перыяд, незадоўга да вызвалення раёна, камандаванне брыгады вырашыла мяне разам з дзецьмі адправіць самалётам за лінію фронту, дзе, між іншым, пасля цяжкага ранення ў ваенным шпіталі г. Калініна ляжаў мой сын Юра. Дзяцей я адправіла (было гэта, здаецца, 2 красавіка 1944 года), а сама адмовілася вылятаць, заявіўшы, што сваё 50-годдзе 6 мая хачу сустрэць на баявым пасту. Так і засталася ваяваць з ворагам да ўз'яднання з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі.

У красавіку таго ж года больш за 50 падпольшчыкаў атрада «Масква», уліўшыся ў састаў 4-й брыгады, перайшлі на адкрытую барацьбу з ворагам. Усе прыбылі ў лагер са зброяй і боепрыпасамі і сталі смелымі воінамі-партызанамі.

У мяне захаваўся дзённік, у якім я апісваю радасць сустрэчы з Чырвонай Арміяй. Радасць была такая, якую ні з чым не параўнаеш. У той жа час мы сумавалі па тых, хто аддаў жыццё за мірнае неба над нашай зямлёй. Некаторыя партызаны адразу ўліліся ў баявыя часці і ваявалі на фронце.

Смерцю храбрых у падполлі, партызанскім атрадзе, на фронце загінулі мае баявыя сябры Аляксей Антонавіч Мілун, Павел Шчасны, Сцяпан Мацюк, Юзя Шубіна, Дзмітрый Фаміч Барок, Ніканор Пахірка, Іосіф Шчасны, Андрэй Шамшур, Міхаіл Сушко, Пётр Адамовіч, Пётр Муха, Іван Скавародка, Піліп Лапцёнак і многія іншыя патрыёты – былыя члены атрада «Масква». Яны ўнеслі свой дастойны ўклад у перамогу над ворагам.